**К. В. Кушнарова**
**г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны**

# ЧАС І ПРАСТОРА ЯК ЧЫННІКІ МАСТАЦКАГА СВЕТУ ТВОРА

Поўную карціну свету немагчыма ўявіць сабе без такіх катэгорый, як час і прастора, таму іх распрацоўка мае вялікае значэнне для навукі, мастацтва і чалавечай культуры ўвогуле. Кожны тып культуры выпрацоўвае сваё адметнае бачанне часу і прасторы. Уяўленні пра дадзеныя катэгорыі паглыбляюцца і змяняюцца па меры развіцця навукі.

Праблеме часу прысвечана шмат філасофскіх работ. Важнасць і актуальнасць катэгорыі часу для навукі падкрэсліваецца наяўнасцю некалькіх падыходаў да яе тлумачэння. Гістарычна ў філасофіі склаліся два падыходы да разумення часу: субстанцыйны і рэляцыйны. Першы разглядае час як працягласць, другі – як пэўнага чыну адносіны паміж аб'ектам і працэсамі. У сувязі з папулярнымі ў навуцы тэндэнцыямі сінтэзу чалавечых ведаў час аналізуецца на матэрыяле разнастайных навук, што дазваляе вылучыць такія яго віды, як: псіхалагічны час, сацыяльны, які з'яўляецца ўнутраным часам грамадскага жыцця і ўключаны ў знешні час прыродных працэсаў – арганічны, геолага-геаграфічны і г. д.

Абнаўленне навуковых уяўленняў аб часе дэманструе практыка сінэргетыкаў і постмадэрністаў. Гэтаксама, як і ў сінэргетыцы, постмадэрнізм сцвярджае ідэю незваротнасці часу. У дачыненні да тэкставага аналізу постмадэрнізм «фармулюе «прынцып незваротнасці», згодна з якім фабульная пабудова наратыву задае фундаментальную і непазбежную «незваротнасць аповеду» (Р. Барт)» [1, с. 739].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Разнастайныя ўяўленні філосафаў аб сутнасці часу знаходзілі сваё выяўленне і ў літаратурных творах. Сучасная літаратура знаходзіцца ў пастаянным пошуку і эксперыментуе з часам. Гэта адлюстроўваюць найбольш выбітныя творы сучасных пісьменнікаў.

Асаблівае сацыяльна-гістрычнае ўяўленне аб часе фарміруе спецыфіка гісторыка-культурнага ладу жыцця. Для старажытнасці было характэрна ўяўленне аб часе, як аб цыклічным працэсе. Гэта было абумоўлена вялікай роляй традыцый, маруднымі пераменамі ў грамадскім жыцці. Згодна з філасофіяй буддызму, у плыні часу ўсё старэе і набліжаецца да пераўтварэння ў нішто. Хрысціянская канцэпцыя часу мае трывалыя паняцці сэнсу мінулага і будучага як грэхападзення, выкуплення і ўратавання. У рускай рэлігійнай філасофіі час тлумачыўся як няспынны, бязлітасны ў адносінах да цяперашняга. Сэнс мае толькі вечнасць, над якой час не мае ўлады.

Такім чынам, разуменне часу залежыць не толькі ад ведання яго фізічнага сэнсу, але і ад суб’ектыўнага ўспрыняцця. Залежнасць ментальнасці этнасу ад тыпу прасторы адзначаецца ў артыкуле А. Мельнікавай «Тып прасторы як этнахарактарызуючы фактар», дзе адзначаецца, што «Сталае пражыванне этнасу ў межах адной тэрыторыі, прасторавая замкнёнасць спрыяюць фарміраванню ў свядомасці чалавека часавага, а не прасторавага ўяўлення» [2, с. 204]. Паводле даследчыцы, скразны для беларускай літаратуры архетып «роднага кута» вызначае «тоеснасць чалавека самому сабе» як істотную рысу ў характары беларусаў.

Суб’ектыўны час мастака, увасоблены ў мастацкім творы, вызначае структуру ўсіх яго катэгорый, у тым ліку і моўнай сістэмы. Па словах Дз. Ліхачова, «Мастацкі час – з’ява самой мастацкай тканіны твора, які падпарадкоўвае сваім задачам і граматычны час і філасофскае яго разуменне пісьменнікам» [3, с. 234].

У тэкстах апошняга часу ўскладняецца выяўленне прасторы і часу, як абавязковых чыннікаў мастацкага свету твора, дэманструючы індывідуальнае бачанне мастаком пазначаных катэгорый і арыгінальнасцю яго канцэпцыі свету. У той жа час існуюць пэўныя тыпалагічныя мадэлі, якія ўяўляюць з сябе «змястоўныя формы», якімі кожны асобны пісьменнік карыстаецца, па заўвазе Б. Есіна, як «гатовымі» [4, с. 59]. Да тыпалагічных мадэлей даследчык адносіць не толькі разнастайныя матывы, але і тыпы арганізацыі мастацкай прасторы: летапісны (яго вылучае Дз. Ліхачоў), авантурны, біяграфічны (М. Бахцін).

Т. Шамякіна, аналізуючы творы класікаў беларускай літаратуры ў кантэксце сувязі з філасофскімі перавагамі таго ці іншага творцы, выяўляе асаблівасці нацыянальнага космасу пры дапамозе хранатопаў, вылучаючы наступныя: верх-ніз, неба-зямля, дрэва спазнання, святло-цемра (Кірыла Тураўскі), пярэварацень-ваўкалак («Слова пра паход Ігаравы»), храм, святло (Францыск Скарына), маці-зямля, зубр (Мікола Гусоўскі), неба, сонца, зямля, вада, час (Сімяон Полацкі), чалавечая душа (Я. Баршчэўскі), іншасвет («Тарас на Парнасе», Ф. Багушэвіч), маці-радзіма (Я. Купала), зямля (Я. Колас, К.Чорны), музыка-мастак (Я. Колас), зямля, вада, васілёк (М. Багдановіч).

Даследчыца робіць вывад аб трыадзінстве зямлі, вады і расліннасці (лесу) ў прыродным ландшафце Беларусі, прадстаўленым у творчасці айчынных пісьменнікаў. Заўважаючы пры гэтым, што «істотным этнахарактарызуючым фактарам з’яўляецца таксама «прывязка» этнасу да пэўнай сістэмы часавай арганізацыі яго жыццядзейнасці» [5, с. 330].

У манаграфіі «Пошук спрадвечнай існасці» (1995) І. Чарота заўважае, што маюцца прычыны шукаць прыкметы асаблівага беларускага хранатопу ў матывах *мяжы і пераходнасці*, семантыка якіх, на думку даследчыка, уласцівая такім распаўсюджаным у літаратуры і фальклоры вобразам, як «крыніца і курган, маладзік і знічка, груша-дзічка і шыпшына, кажан і зубр, а таксама васілёк, жалейка, хмаркі, рунь» [6, с. 104]. Далей у рабоце адзначаецца: «Рух часу ў беларускім светаадлюстраванні таксама набывае своеасаблівыя акцэнты на стадыях пераходу» [6, с. 105]. Сярод такіх акцэнтаў даследчык вылучае: вясну, пярэдадзень, конадзень, Купалле (дзе асаблівае значэнне маюць змярканне, поўнач, досвітак). Таксама адзначаецца асаблівая ўвага да раніцы і вечара як часу сутак.

Літаратурны твор заўсёды з’яўляецца пэўным вынікам мастацкага пазнання свету. Важнасць вывучэння катэгорый часу і прасторы ў мастацкім тэксце заключаецца ў тым, што ўзнікшая ў творчай свядомасці карціна свету з адметным хранатопам выражае канцэпцыі эпохі і культуры, да якіх належыць пісьменнік. Да ліку творцаў, што плённа выкарыстоўваюць багатую міфалагічную спадчыну беларускага народа, можна аднесці і Ганну Навасельцаву. У невялікіх па аб’ёме творах (апавяданні «На векавечных межах...», «Бурлівая крыніца», «Лесавік, вадзянік, палявік») прадстаўлена большасць міфалагем, характэрных для беларускай літарату-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ры і культуры ўвогуле: крыніца, хмары, ваўкалак, чарадзей, курган, мяжа і г. д. У цэнтр большасці апавяданняў пісьменніцы пакладзены хранатоп лесу.

Аснову сюжэта апавядання «На векавечных межах…» складае матыў пераўтварэння чалавека ў жывёлу (міфічную), ці ў прыродны аб’ект (крыніцу), або ў расліну (дрэва). Амбівалентнасць у творы набываюць вобразы ясеня (даўно зачараванага чалавека); чараўніка, здольнага абарочвацца кажаном; ваўкалака, які прымае неабходны яму зараз выгляд; хлопца з абраным лёсам, які ператвараецца са звычайнага чалавека ў пераможцу нячысцікаў. Вялікае значэнне ў творы мае і час, калі адбываюцца падзеі. Напрыклад, некаторыя з іх могуць здзейсніцца толькі ў строга акрэслены час – чарадзейную ноч.

Матыў пераўтварэння пакладзены і ў аснову сюжэта аповесці «Бурлівая крыніца». Князёўна, якой перадаюцца магічныя веды, пераўтвараецца ў крыніцу і чакае пэўнага часу, каб перадаць свае веды далей. Важнае значэнне ў творы маюць і традыцыйныя для беларускай культуры вобразы ветру, хмары і снегу.

Творы пісьменніцы сведчаць, што традыцыйная для беларускай літаратуры ўвага да фальклорнай паэтыкі з цягам часу толькі ўзмацняецца, эвалюцыянуючы ад стылізацый пад народную творчасць да стварэння адметных міфалагем, з апорай на разгалінаваную нацыянальную міфалагічную сістэму.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1 Новейший философский словарь. – 2-е изд., перераб. и доп. – Минск : Интерпрессервис ; Книжный Дом. – 2001. – 1280 с.

2 Мельнікава, А. Тып прасторы як этнахарактарызуючы фактар / А. Мельнікава // Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся: праблемы вывучэння і захавання ў постчарнобыльскі час : зб. навук. арт. / рэдкал. : А. А. Станкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006. – С. 203–208.

3 Лихачев, Д. С. Поэтика древнерусской литературы / Д. С. Лихачев. – 3-е изд. – М. : 2-я типография издательства «Наука», 1979. – 359 с.

4 Есин, А. Б. Время и пространство / А. Б. Есин // Введение в литературоведение: Основные понятия и термины : учеб. пособие / Л. В. Чернец, В. Е. Хамцев, С. Н. Бройтман [и др.] ; под ред. Л. В. Чернец. – М. : Высш. шк.; Издательский центр «Академия», 1999. – С. 47–62.

5 Шамякіна, Т. І. Міфалогія і беларуская літаратура: нарысы і эсэ : для ст. шк. узросту / Т. І. Шамякіна ; пасляслоўе І. Чароты. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 391 с.

6 Чарота, І. А. Пошук спрадвечнай існасці: Беларуская літаратура XX стагоддзя ў працэсах нацыянальнага самавызначэння / І. А. Чарота. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 159 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ